10. Кондратьев, Н. Д. Мировое хозяйство и его конъюнктуры во время и после войны / Н. Д. Кондратьев. – Вологда, 1922. – 258 с.
11. Большие циклы конъюнктуры и теория предвидения / Н. Д. Кондратьев; Междунар. фонд Н. Д. Кондратьева [и др.]. – М. : Экономика, 2002. – 765, [2] с.
12. Гайсин, Р. С. Долгосрочные циклы конъюнктуры агропродовольственного рынка / Р. С. Гайсин // Научное наследие Н. Д. Кондратьева и современность: X Международная Кондратьевская конференция 25–30 сентября 2017 г.: сборник тезисов докладов и выступлений участников Конференции. – Москва – Волгоград, 2017. – 416 с.
13. Возвращенные имена: Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталин. репрессий / сост. и авт. предисл. Н. В. Токарев; под ред. А. С. Махнача. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 120 с.
14. Ясный, Н. Советсие экономисты 1920-х гг. Долг памяти / Н. Ясный. – М.: Издательский дом “Дело”, 2012. – 344 с.
15. Фомина, А. В. Циклы Кондратьева в экономике России / А. В. Фомина. – М., 2005. – 146 с.

УДК 94(476):339

# НОВАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА І АСАБЛІВАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

Ходзін С.М., загадчык кафедры
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

Ключавыя словы: новая эканамічная палітыка, мадэрнізацыя, дзяржаўныя інстытуты.

Рэферат. Артыкул прысвечаны аналізу нацыянальнай мадэрнізацыі ў Беларусі ў перыяд новай эканамічнай палітыкі.

Змест эканамічнай палітыкі – гэта, найперш за ўсё, дзейнасць дзяржавы, ступень яго ўмяшання ў ажыццяўленне эканамічных працэсаў. Ужо ў 1920-я гг. у сусветнай практыцы вызначылася неабходнасць комплекса дзяржаўных мерапрыемстваў, які з цягам часу даследчыкі абагульнілі пад назвай «эканамічная палітыка». Па сутнасці, гэта паводзіны дзяржавы ў эканоміцы як выяўленне сукупнай волі грамадства праз рашэнні і дзеянні урада. Эканамічная палітыка акрэсліваецца праз вызначэнне прававых норм, уздзеянне на гаспадарчыя працэсы, выкарыстанне дасягненняў навукі. Пры гэтым, асабліва істотным на этапе пераходу ад традыцыйнага грамадства да індустрыяльнага, з’яўляецца ўлік прыродна-кліматычнага і дэмаграфічнага (рэсурснага) фактараў, асаблівасцяў гістарычнага развіцця і фактару сацыяльнай псіхалогіі насельніцтва, што выяўляецца ў сістэме эканамічных паводзін суб’екта гаспадарання. Істотнае значэнне мае наяўнасць шырокага ці абмежаванага гістарычнага вопыту.

Магчымасці выпрацоўкі і рэалізацыі нацыянальнай мадэлі мадэрнізацыі, перадумовы якой фарміруюцца з 1921 г., залежалі найперш ад развіцця дзяржаўных інстытутаў Беларусі [1, с. 39–40]. Частка яе тэрыторыі апынулася пад уладай Польшчы, а савецкая была падзелена паміж БССР, адроджанай першапачаткова ў межах 6 паветаў былой Мінскай губерні, і Расійскай Федэрацыяй. Умовы развіцця гэтых тэрыторый складваліся па-рознаму. Фарміраванне і рэалізацыя агульнадзяржаўнай палітыкі ўскладняліся не толькі падзеленасцю тэрыторыі Беларусі, але і ўнутрыпалітычнай

сітуацыяй ў адроджанай БССР. Па сутнасці, нягледзячы на Рыжскую дамову, на яе тэрыторыі працягваліся ваенныя дзеянні. Гэта адлюстравана ў назвах дакументаў, якія паказвалі наяўнасць як унутранага, так і замежнага фронту [2, л. 2–6]. Цяжкае эканамічнае становішча беларускага сялянства пагаршалася аграрнай перанаселенасцю вёскі, малазямеллем [3, л. 2, 6]. Да рэвалюцыі ў такіх губернях, як Гомельская і Віцебская, значная частка насельніцтва была занятая адыходнымі промысламі, саматужніцтвам, што забяспечвала занятасць і папаўняла бюджэты сялянскіх сем'яў. У выніку вайны і разрухі прыйшлі ў заняпад саматужныя промыслы. На глебе беспрацоўя амаль цалкам спынілася адыходніцтва. Ратуючыся ад голаду, у вёску вярнулася частка рабочых з гарадоў.

У новаабвешчанай Савецкай Беларускай Рэспубліцы на працягу 1921 г. доўжылася рэалізацыя мерапрыемстваў, характэрных для «ваеннага камунізму» [4]. Хлебанарыхтоўкі праходзілі ва ўмовах варожых адносін сялянства. Ва ўмовах незавершанасці нацыявытворчых працэсаў сацыяльна-эканамічныя прычыны ваеннага супраціву паглыбляліся ідэйнымі і канфесійнымі, спела разуменне сваёй дзяржаўнасці. Насельніцтва БССР атрымала магчымасць рэалізоўваць не толькі планы бальшавікоў, але і ствараць уласную перспектыву. Рэальныя ўмовы паступова прымушалі савецкае кіраўніцтва звярнуцца да новай эканамічнай палітыкі і перагледзець палітыку нацыянальную.

У савецкай літаратуры выключнае значэнне надавалася рашэнням X з'езда партыі. Можна сцвярджаць, што такі падыход замацаваўся пазней, пры распрацоўцы адпаведнай канцэпцыі гісторыі «у бальшавіцкім духу» [5, с. 226]. У рэзалюцыі Ўсерасійскай партыйнай канферэнцыі 26 мая 1921 г. пазначаліся ў якасці важнейшай задачы – НЭП, а «яе асноўным рычагом – тавараабмен праз кааперацыю» [6, л. 13]. Лозунг свабоды гандлю гучаў гэтак жа контррэвалюцыйна як «саветы без бальшавікоў» У прыватным капітале бачылі толькі пагрозу [7, с. 84]. Толькі ў сярэдзіне 1921 г. кіраўнік бальшавікоў У. І. Ленін адмаўляецца ад правядзення ў жыццё марксісцкага пастулата аб неабходнасці стварэння такога эканамічнага механізма, які б функцыяніраваў без таварна-грашовых адносін. І не Кранштацкі мяцеж быў адзінай таму прычынай. Пагроза новай сялянскай вайны стала найбольш істотным вызначальным фактарам перагляду догмаў [1, с. 77–79]. Толькі 6 студзеня 1922 г. Цэнтральнае Бюро КП(б)Б, пасля ўважлівага вывучэння спраў на месцах, прыняло пастанову лічыць магчымым зняць ваеннае становішча ў рэспубліцы.

Справаздача аб дзейнасці Наркамзема РСФСР за 1917–1922 гг. выдзяляе чатыры асноўныя этапы аграрнай палітыкі. У аснову іх былі пакладзены рашэнні з'ездаў Саветаў, а не партыйных структур. Па меркаванні аўтараў дакумента, самастойным рубяжом з'яўляецца час ад VIII да IX Усерасійскага з'езда Саветаў (снежань 1920 г.– снежань 1921 г.): «ад перамогі на франтах да самадзейнасці сялянскіх мас». Мэтай гэтага этапу з'явілася стымуляванне сялян да пашырэння свайго ворыва. А вось у дачыненні да рашэнняў IX Усерасійскага з'езда Саветаў у снежні 1921 г. сцвярджаецца, што гэта пачатак палітыкі, накіраванай на «ўзняцце самадзейнасці сялянскага насельніцтва на глебе гаспадарчага разліку і асабістай іх зацікаўленасці ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі» [8, л. 3–9]. Менавіта на гэтым з'ездзе У. І. Ленін пазначае, што саюз сялянства і рабочага класа павінен быць пабудаваны «на іншых пачатках». «Асновай, сутнасцю эканамічнай сувязі, – падкрэслівае ён, – павінен стаць гандаль».. «Для камуністаў, – працягвае ён, – гэта непрыемнае адкрыццё. Вельмі можа стацца, што гэтае адкрыццё – надзвычай непрыемнае…» [9, с. 13–14]. Кіраўнік бальшавікоў сцвярджаў, што неабходна вучыцца, неабходны новы культурны ўзровень, гэта патрабуе «новай культуры», і некалькі разоў паўтарыў: «...навучыцца працаваць іншымі тэмпамі, лічачы работу дзесяцігоддзямі, а не месяцамі, "тут праца цэлых дзесяцігоддзяў"» [9, с. 23, 24].

У той жа час наркам земляробства БССР А. С. Славінскі заўляў: «Вы называеце гэта новай эканамічнай палітыкай? Гэта анархія, і анархію неабходна спыніць». Ён заклікаў абапірацца на камуны і сельскагаспадарчыя арцелі [10, л. 192, 219, 220]. Каб зразумець падтрымку пазіцыі наркама шэраговымі партыйцамі, неабходна ўлічваць не толькі рэвалюцыйны падыход да справы. Да 1917 г. прамысловасць Беларусі развівалася бліжэй да сыравіны і таннай рабочай сілы. Значная частка прадпрыемстваў стваралася на вёсцы, у тым ліку – у памешчыцкіх маёнтках. Разбурэнне эканамічнай прасторы былых памешчыцкіх маёнткаў разрывала эканамічныя сувязі і прыводзіла да закрыцця прадпрыемстваў і скарачэння колькасці рабочых. Па меры фарміравання новых поглядаў на тэмпы і формы мадэрнізацыі вёскі, пазіцыя А. С. Славінскага, у рэшце рэшт, прывяла яго да разыходжанняў з пазіцыяй ЦВК БССР і адстаўцы па стану здароўя (1924 г.) [11, л. 2].

Варта адрозніваць эканамічную палітыку і пэўны гаспадарчы механізм, які павінен забяспечыць яе рэалізацыю. Адпавядаючая пэўнаму палітычнаму курсу гаспадарчая сістэма складаецца паступова і толькі з часам выцясняе старую сістэму. Сельгаспадатак быў важнейшым, але толькі першапачатковым элементам новага гаспадарчага механізма, які склаўся да 1924/25 гасп. года. У адпаведнасці з рашэннямі IX Усерасійскага з’езда Саветаў 22 мая 1922 г. на III сесіі УЦВК быў прыняты «Асноўны закон аб працоўным землекарыстанні», які ствараў умовы для развіцця вытворчых сіл на вёсцы і даваў права на свабодны выбар формаў гаспадарання, сельскія жыхары маглі адкрыта выкарыстоўваць магчымасці рынку, самастойна рэалізоўваць атрыманы прыбытак, арэндаваць зямлю і прымяняць наёмную працу. З мая 1922 г., шмат пазней чым у іншых рэгіёнах Савецкага Саюза, у БССР пачаўся перавод саўгасаў на гаспадарчы разлік [12, с. 53]. Па меркаванні Старшыні ЦВК БССР А. Р. Чарвякова, у Беларусі пераход да новай эканамічнай палітыкі ажыццяўляўся ў больш цяжкіх умовах, чым у іншых рэспубліках СССР. Тут меўся надзвычай разгалінаваны прыватнагандлёвы апарат, які канцэнтраваў у сваіх руках 93 % гандлёвай сеткі, а такім чынам, і амаль усё абслугоўванне сялянства [13, л. 117, 119].

Адмаўленне новай эканамічнай палітыкі наркомам земляробства А.С.Славінскім, безумоўна, акрэслівала перавагу кансерватыўных тэндэнцый. Але менавіта гэтае адмаўленне новаўвядзенняў з цэнтра, як здарылася і потым – у гарбачоўскія часы “перабудовы”, у сярэдзіне 1920-х гг. прывяло да вызначэння сваёй палітыкі рэформаў з улікам традыцый і прыродна-геаграфічнага асяроддзя рэспублікі. Калі характарызаваць асаблівасці беларускай мадэлі мадэрнізацыі ў 1920-я гг., то асабліва заўважнымі з’явіліся адрозненні ў галіне зямельнай палітыкі і зямельнага заканадаўства. Асноўныя палажэнні апіраліся на агульныя традыцыі адмовы ад прыватнай уласнасці на зямлю. Яшчэ да першага ўзбуйнення ў БССР быў распрацаваны Зямельны кодэкс 1923 г., які істотна адрозніваўся ад Зямельнага кодэкса РСФСР 1 снежня 1922 г., у першую чаргу ў сферы абшчынных адносінаў [490]. 21 лютага 1925 г. быў зацверджаны Зямельны кодэкс, які распаўсюджваў свой уплыў на ўсю тэрыторыю Савецкай Беларусі [14]. Галоўнае адрозненне было ў непрыманні абшчыннай формы землекарыстання, не дапускаліся і ўраўняльныя перадзелы. Ва ўмовах нізкай якасці глебы было вельмі важна падтрымаць зацікаўленасць сялянства ў іх паляпшэнні. Імкнучыся абмежаваць ураўняльныя тэндэнцыі, пераважаючыя ў некаторых усходніх акругах БССР, было вызначана, што ўстанаўленне нормы надзялення зямлёй застаецца за наркаматам земляробства.

Зямельны Кодэкс РСФСР 1922 г. утрымліваў асобны раздзел, які рэгламентаваў абшчынны парадак землекарыстання і перадзелы зямлі. Аднак, нават абмежаванне перадзелаў земляў Зямельным кодэксам 1922 г. сялянства Расійскай Федэрацыі сустрэла з выразным незадавальненнем. Ідучы насустрач яго патрабаванням, у канцы 1927 г. урад РСФСР дазволіў правесці агульны ўраўняльны перадзел зямлі ў тых

зямельных таварыствах, дзе іх яны не праводзілі з 1922 г., і ў якіх захавалася значная нераўнамернасць у землекарыстанні двароў. «У гэтых выпадках, – піша Л. В. Аліева, – агульны перадзел зямель мог адбывацца нават па патрабаванню меншасці членаў таварыства» [15, с. 150].

Заўважна захаванне традыцый яшчэ ў адным істотным аспекце. Калі зямля доўгі час не апрацоўвалася, то карыстальнік (як раней уладальнік) гублялі свае правы на яе і надзяляліся зямлёй пры вяртанні ўжо на іншых асновах і ў іншым месцы (гэта мела месца ў абодвух кодэксах – п. 16 Кодэксаў 1923 г. і 1925 г.). Рэалізуючы працоўны прынцып землекарыстання, беларускія кодэксы абмяжоўвалі магчымасці здаваць зямлю ў арэнду як пэўнымі ўмовамі, так і тэрмінамі. Да таго ж, у адрозненне ад Кодэкса Расійскай Федэрацыі 1922 г. (з папраўкамі ад 1926 г.), арэнда дапускалася толькі працоўная, арэндатар мог атрымаць толькі такую колькасць зямлі, якую ён мог апрацаваць сіламі свайго двара (п. 30 Кодэкса 1923 г. і Кодэкса 1925 г.). Гэтаксама Раздзел III Кодэксаў дапушчаў наёмную працу толькі пры ўмове калі «усе наяўныя працаздольныя члены гаспадаркі разам з наёмнымі рабочымі прымаюць удзел у працы гаспадаркі» (п. 39). Сацыяльныя ўзаемаадносіны ў вёсцы рэгуляваліся раздзелам IV Кодэксаў («Аб зямельным таварыстве (таварыстве землекарыстальнікаў)»)  [16].

Важнейшай рысай эканамічнай палітыкі ў Беларусі акрэсліваўся разлік на ўласныя рэсурсы. Абгрунтоўваючы неабходнасць максімальнага ўліку прыродна-геаграфічных ўмоў з мэтай разліку на ўласныя рэсурсы Беларусі, А. А. Смоліч распрацаваў тэорыю рацыянальнага размяшчэння гаспадарчых комплексаў (эканомгеаграфічных ландшафтаў) [17].

Рост калектыўных гаспадарак да 1924 г. і яго адсутнасць у 1924–1927 гг. дазволілі значнай колькасці беларускіх савецкіх даследчыкаў суадносіць гэты факт з дзейнасцю кіраўніка камісарыята земляробства рэспублікі Д. Ф. Прышчэпава. У постсавецкі ж перыяд гэта дало падставу бачыць у савецкім наркаме абаронцу будучага фермерства. Праведзенае вывучэнне дазваляе не згадзіцца з такім сцвярджэннем [18]. У той час, як кіраўніцтва КП(б) Беларусі лічыла, што кааперацыя не апраўдала спадзяванняў, «калектыўныя гаспадаркі…амаль ніякай велічыні не ўяўляюць», «саўгасы з’яўляюцца ў вёсцы прыкладам нашага дрэннага гаспадарання», падтрымліваючы развіццё індывідуальнага землекарыстання, наркамат земляробства БССР акцэнтаваў развіццё шматстайных форм кааперацыі [19, л. 4]. Д. Ф. Прышчэпаў падкрэсліваў, што прызнаючы за селянінам права выбару, дзяржава не можа цалкам адмовіцца ад права заахвочваць тую ці іншую форму землекарыстання [1, с. 86]. У Перспектыўным плане развіцця сельскай і лясной гаспадаркі БССР на 1925/26–1929/30 гг. падкрэслівалася, што менавіта пасялковая форма землекарыстання з агульным шматпольным севазваротам і без яго «адказвае асноўнай мэце НКЗ – абагульненню сельскай гаспадаркі шляхам кааперавання (у асаблівасці, вытворчага) земляробчага насельніцтва» [20, с. 136].

Безумоўна, характэрнай рысысай новай эканамічнай палітыкі – наяўнасць значнай колькасці супярэчнасцяў: паміж цэнтрам і рэспублікамі, паміж ступенню ініцыявання рыначных адносін і эканамічнай свядомасцю сялянства і інш. Гэтыя супярэчнасці адлюстроўваліся найперш у падатковай палітыцы, якая ў 1920-я гг. выяўлялася асноўным рэгулятарам сацыяльных адносін у вёсцы ў дачыненні да розных груп насельніцтва. Нягледзячы на тое, што перавага надавалася прамому падаткаабкладанню, колькасць плацяжоў разам з мясцовымі зборамі налічвала больш дзесяці. У якасці аб’ектаў падаткаабкладання вяскоўцаў выступалі зямля, жывёла, іншая маёмасць, прыбытак і г. д. Пры гэтым структура плацяжоў, памер ставак і іншыя паказчыкі змяняліся на некалькі разоў на працягу аднаго года [7, с. 84–85].

Заўважнай рысай эканамічнай палітыкі другой паловы 1920-х гг. выяўляецца спроба яе навуковага абгрунтавання. Менавіта ў гэты час складваюцца навуковыя

беларускія школы ў галіне аграрных навук [21]. Сярод найбольш яркіх прадстаўнікоў можна назваць С. В. Скандракова, Е. Л. Ярашчука, Г. І. Гарэцкага, А. А. Смоліча, І. А. Кіслякова. Гэтыя вучоныя, хоць і фарміраваліся пад уплывам расійскіх, аднак акрэслена выяўлялі імкненне вывучыць і ўлічыць асаблівасці і традыцыі Беларусі як асобнай гаспадарчай сістэмы. На аснове выкарыстання навуковых прынцыпаў і падыходаў быў распрацаваны «Перспектыўны план развіцця сельскай і лясной гаспадаркі БССР на 1925/26–1929/30 гг.». У сярэдзіне 1920-х гг. шырока абмяркоўваўся генеральны план развіцця меліярацыі ў БССР. Прымяненне навуковых дасягненняў – адна з найбольш істотных прыкмет мадэрнізацыі.

Такім чынам, пераход да эканамічнай палітыкі, з IX Усерасійскага з’езду Саветаў у снежні 1921 г. акрэсліваецца пачатак палітыкі, асновай якой вызначалася прызнанне гандлю, таварна-грашовых адносін як асновы ўзаемадзеяння паміж горадам і вёскай. Гэта, па сутнасці, і з’явілася адной з асноўных умоў фарміравання нацыянальнай мадэлі мадэрнізацыі. Асаблівасцю новай эканамічнай палітыкі ў БССР з’яўлялася яе трансфармацыя па меры ўзбуйнення тэрыторыі. У Беларусі, якая з’яўлялася тэрыторыяй ваенных дзеянняў, замена харчовай развёрсткі харчовым падаткам не прывяла да істотных змен у аграрнай палітыцы і не атрымала станоўчага водгуку сялянства. На працягу 1921–1924 гг. складваліся перадумовы для ажыццяўлення нацыянальнай мадэлі мадэрнізацыі: адмена надзвычайнага становішча, узбуйненне тэрыторыі БССР, фарміраванне і ўмацаванне прававых інстытутаў, станаўленне дзяржаўнасці і замацаванне тэрытарыяльных межаў Беларусі. Сялянства атрымала магчымасць адукацыі на роднай мове, выбару формаў гаспадарання на зямлі, стала крыніцай для вылучэння кіраўнічай эліты. Важнейшай рысай нацыянальнай палітыкі мадэрнізацыі (1925–1927 гг.) з’явіліся апора на ўласныя сілы і рэсурсы, улік традыцый і асаблівасцяў развіцця Беларусі, якія беларускае кіраўніцтва імкнулася ўлічыць пры ўсіх хістаннях курса бальшавіцкай партыі.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Ходзін, С. М. Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921–1939) / С. М. Ходзін. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2014. – 240 с.

2. Журнал военных действий штаба войск Минского района за август – декабрь 1921 г. 1 августа 1921 – 31 декабря 1921 г., на 100 л. // РДАЭ. – Ф. 1235. Воп. 96. Спр. 81.

3. Народный комиссариат земледелия РСФСР // РДАЭ. – Ф. 478. Воп. 1. Спр. 93.

4. Очередные задачи партии в связи с восстановлением хозяйства // Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1970) : [в 16 т.] / Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Изд. 8-е, доп. и испр. – М., 1970. – Т. 2 : 1917–1924. – С. 301–307.

5. Ліндне́р, Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. / Р. Ліндн́эр ; навук. рэд. Г. Сагановіч ; пер. з ням. Л. Баршчэўскага. – Мінск ; СПб. : Неўс. прасцяг, 2003. – 538 с.

6. Резолюция Всероссийской партийной конференции от 26 мая 1921 г. о задачах партийных и советских работников по проведению новой экономической политики (НЭПа), циркуляры и инструкции ЦК РКП(б), положения о фракциях РКП(б) профсоюзов и межсоюзных объединениях, вовлечении работниц и крестьянок в промысловую кооперацию. 1 февраля 1921 г. – 6 марта 1922 г. 75 л. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 470.

7. Доўнар, Л. А. НЭП у Беларусі: эканамічная палітыка савецкай дзяржавы ў адносінах да прыватнай прамысловай вытворчасці / Л. А. Доўнар // Беларуская думка. – 2016. – № 1. – С. 84–90.

8. Отчет о деятельности Наркомзема за 1917–1922 гг. и доклад «Основные сравнительные данные, характеризующие результаты земельной политики за годы революции» (без автора). 1922, на 218 л. // РДАЭ. – Ф. 478 Наркамзем РСФСР. Воп. 1. Спр. 851.

9. Девятый Всероссийский съезд Советов рабочих, крестьянских, красноармейских и казачьих депутатов : стеногр. отчет, 22–27 дек. 1921 г. – М. : Изд. ВЦИК, 1922. – 316 с.

10. Стенограмма VI съезда (XI конференции) КП(б)Б Белоруссии. 15–19 марта 1922 г. 243 л. // НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 688.

11. Протоколы заседаний пленума ЦБ КП(б)Б, проект Конституции БССР. 5 января – 8 августа 1924 г. 32 л. // НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1260.

12. Сорокин, А. Н. Совхозы БССР в период построения фундамента социализма (1926–1932 гг.) / А. Н. Сорокин ; науч. ред. И. С. Кравченко. – Минск : Наука и техника, 1971. – 176 с.

13. Стенограмма V съезда КП(б)Б (X конференции) от 15–20 октября 1921 г. 334 л. // НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 417.

14. О введении в действие Земельного кодекса : постановление ЦИК ССР Белоруссии, 29 марта 1923 г. // Збор законаў і распараджэнняў Рабоча-Сялян. урада БССР. – 1923. – № 6. – Ст. 55.

15. Алиева, Л. В. Реализация земельного кодекса РСФСР 1922 г. в контексте эволюции крестьянской поземельной общины (на материале Псковской губернии) / Л. В. Алиева // Псков. – 2006. – № 24. – С. 148–152.

16. О введении в действие единого Земельного кодекса на всей территории БССР : постановление Президиума ЦИК БССР, 21 февр. 1925 г. // Збор законаў і распараджэнняў Рабоча-Сялян. урада БССР. Аддз. першы. – 1925. – № 11. – Ст. 93.

17. Смоліч, А. Сельскагаспадарчыя раёны Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў 1927–1928 гадах : папярэд. схема і мэтадал. увагі / А. Смоліч. – Мінск : [б. в.], 1930. – 138 с.

18. Ходин, С. Н. Вернуться к цветному изображению: еще раз о наркоме Д. Ф. Прищепове / С. Н. Ходин // Полит. собеседник. – 1991. – № 2. – С. 12–15; Ходзін, С. М. Д. Ф. Прышчэпаў: гісторыя асобы як гісторыя краіны / С. М. Ходзін // Российские и славянские исследования : науч. сб. / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2014. – Вып. 9 – С. 131–142.

19. Стенограмма заседания пленума ЦК КП(б)Б от 2–8 мая 1925 г. 104 л. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1992.

20. Перспективный план развития сельского и лесного хозяйства БССР на 1925/26–1929/30 г. : утв. Правительством / А. М. Михайлов [и др.] ; ред.: И. В. Ремизов [и др.]. – Минск : Изд. Нар. комиссариата земледелия БССР, 1927. – VIII, 960 с.

21. Гусаков, В.Г. История и экономика «крестьянского вопроса» / В. Г. Гусаков; Белорусский научно-исследовательский институт экономики и информации АПК. – Минск, 1997. – 167 с.